**КОНКУРС**

# Натхнёныя Палессем

**Падведзены вынікі абласнога краязнаўча-турыстычнага конкурсу «Магія Палесся», прысвечанага памяці вядомага краязнаўцы, абаронцы дзікай прыроды, экскурсавода, падарожніка і фатографа Аляксея Дуброўскага.**



*Вучні Табульскай СШ з арганізатарамі конкурсу Сяргеем Плыткевічам і Таццянай Хвагінай*

Конкурс доўжыўся амаль што год. Ён быў арганізаваны Рэспубліканскім фондам развіцця турызму і падтрымкі дзікай прыроды «Планета без межаў» і Беларускім грамадскім аб'яднаннем экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў пры падтрымцы ўпраўлення спорту і турызму Брэсцкага аблвыканкама, Пінскага раённага і гарадскога выканаўчых камітэтаў.

У творчым спаборніцтве ўзялі ўдзел больш за 100 юных жыхароў Брэсцкай вобласці. За перамогу яны змагаліся ў шасці намінацыях – краязнаўства, экалогія, этнаграфія і фальклор, турызм і экскурсіі, фатаграфія і малюнак. Геаграфія конкурсу была даволі шырокай – у выніку ў лік лепшых увайшлі школьнікі і навучэнцы цэнтраў дзіцячай творчасці з Брэста, Пінска, Лунінца, Століна, Івацэвічаў, а таксама Пінскага, Столінскага, Івацэвіцкага, Баранавіцкага, Бярозаўскага і Маларыцкага раёнаў. Журы адзначыла дыпломамі 68 конкурсных работ. Асабліва паспяхова праявілі сябе прадстаўнікі школ Пінскага раёна, якія заваявалі каля 30 дыпломаў у розных намінацыях! Поўны спіс пераможцаў можна знайсці на сайце planetabelarus.by.

У гарадскім пасёлку Лагішын ушанавалі пераможцаў і лаўрэатаў з Пінскага раёна. Дыпломы і падарункі ім уручылі заснавальнік інфармацыйнага партала planetabelarus.by, кіраўнік Рэспубліканскага фонду развіцця турызму і падтрымкі дзікай прыроды «Планета без межаў», вядомы фатограф Сяргей Плыткевіч, намеснік старшыні Беларускага грамадскага аб'яднання экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў, аўтар шэрагу кніг пра Пінск і Палессе, экскурсавод Таццяна Хвагіна, намеснік старшыні Пінскага райвыканкама Дзмітрый Палхоўскі і начальнік аддзела па адукацыі Пінскага райвыканкама Віктар Гаўрыловіч.

**Наталля МІЛЕЎСКАЯ**
**Фота аўтара**